## Экскурсія ў этнаграфічны міні-музей “Стужка часу”

Мэта: развіццё пазнавальнай цікавасці да сваёй этнічнай прыналежнасці, уяўленняў пра сябе, як частку беларускага грамадства.

Праграмныя задачы:

прадаўжаць знаёмства дзяцей з жыццём, бытам, заняткамі продкаў;

узбагачаць слоўнікавы запас дашкольнікаў;

выхоўваць любоў да роднай мовы, павагу да гістарычнага мінулага Беларусі.

Ход занятку

Выхавальнік расказвае пра гісторыю заснавання міні-музея, пераходзячы з дзецьмі ад аднаго экспанату да другога, знаёміць з іх прызначэннем.

**Выхавальнік.** Першымі экспанатамі нашага міні-музея былі лялькі ў беларускіх уборах, лапці, вырабы з саломкі, саматканыя ручнікі, вышытыя бабулямі.Усё, што тут прадстаўлена, сабрана супрацоўнікамі дзіцячага саду сумесна з бацькамі выхаванцаў. Называецца наш музей “Стужкачасу”.

Калі ў чалавека ёсць Радзіма – ён не сірата. А як называецца наша Радзіма?

**Дзеці.** Наша Радзіма – Рэспубліка Беларусь. (Гучыць музыка, выхавальнік паказвае пейзажныя замалеўкі Беларусі).

**Выхавальнік.** Калі вы жывеце ў Беларусі, то хто вы? А на якой мове мы зараз з вамі размаўляем?

**Дзеці.** Мы – беларусы і размаўляем па-беларуску.

Дзеці, сёння нас запрашае да сябе ў госці лялька Васіліна. Давайце хутчэй збірацца (гучыць беларуская музыка). Хто ж нас чакае! (стук у дзверы).

**Васіліна.** Міласці просім! Колькі тут дзетачак, прыгожых юных кветачак. Садзіцеся, калі ласка, адпачніце, і вам давядзецца сёння цікавыя рэчы пазнаць, у гульні пагуляць. Бачыце, як у мяне цікава, прыгожа. А хочаце даведацца, што ў мяне ёсць? Ну, дык падыходзьце да стала.

**Выхавальнік.** Дзеці, паглядзіце, што гэта такое прыгожае ў Васіліны. Адгадайце загадку:

Раніцу кожную лашчыць, сушыць шыю, рукі і твар. Што гэта такое?

**Дзеці**. Ручнік

**Васіліна.** (паказвае дзецям ручнікі). Гэтыя ручнікі захаваліся ад маёй матулі, яна сама ткала іх з льняных нітак і вышывала прыгожыя ўзоры.

Матуля засцілала сталы, калі чакала гасцей, і ў хаце адразу станавілася ўтульна. Яшчэ ручнік заўсёды лічыўся сімвалам чысціні, цяпла

роднай хаты. Сапраўдны ручнік могуць вышыць людзі з чыстай душой, шчырым сэрцам.

З каласоў жытнёвых ён сатканы, Наш ручнік, наш
беларускі ўзор. Васільком, пралескай вышываны,
Хвалямі блакітнымі азёр. Зіхаціць ручнік наш
саматканы, Родны беларускі наш узор,
І глядзіш, глядзіш зачараваны –
На дзівосны, казачны ўбор.

Дзеці, а як выдумаеце, для чаго людзям патрэбны ручнікі?

**Дзеці**. Выціраць рукі, твар, посуд і г.д.

**Выхавальнік.** Малайцы! Вельмі рада, што вы так шмат ведаеце аб ручніках. Але ж, каб ручнік атрымаўся, трэба папрацаваць. І праца гэта нялёгкая. Нездарма наш народ склаў шмат прымавак і прыказак аб працы. Давайце іх успамінаць. Я буду называць першую частку, а вы – другую.

Дзе няма ахвоты – *там няма работы.*

Зямлю грэе сонца – *а чалавека праца.*

Дзе гультай ходзіць – *там зямля не родзіць.*

Дзеці, а вы незаўважылі, што на ручніках узоры вышыты рознымі колерамі? Заўважылі, малайцы! Я вам зараз растлумачу, што які колер абазначае.

Перад вамі рознакаляровыя палосачкі. Выцягвайце іх па чарзе і называйце колер, а я буду тлумачыць, што ён абазначае. Вось чорны колер – гэта Зямля. Толькі яна ў нас адзіная і нязменная. На ёй мы працуем. Чырвоны колер – гэта жыццё, а жоўты –надзея, яе чалавек нясе ў сэрцы праз усё жыццё. А вось белы колер – гэта колер чысціні душы і спраў. Вось так, зразумела?

Дзеці, вы ўважліва разгледзьце узоры на ручніках, бо мы з вамі будзем потым іх маляваць на паперы.

(Пад ціхую музыку дзеці разглядаюць узоры на ручніках. Затым падыходзяць да сваіх сталоў і малююць беларускія ўзоры на аркушах паперы).

**Выхавальнік.** Васілінка, а ты не хочаш з дзеткамі пагуляць?

Карагодная гульня “Лянок”.

Апісанне гульні: з ліку тых, хто прымае ўдзел у гульні, выбіраецца “бабуля”. Астатнія становяцца ў круг. Яны пытаюцца:

– Што ты, бабуля, нам прасці дасі? Бабуля выходзіць у цэнтр круга і адказвае:

– Старым бабулькам воўны пасмачку, а прыгожым маладзічкам белы

лянок!

Пасля гэтага дзеці разам з бабуляй пачынаюць спяваць, паказваючы рухамі дзеянні, пра якія гаворыцца ў песні:

А мы сеялі, сеялі лянок, Белы,
слаўны кужалёк! Урадзіся, наш
лянок! Урадзіся, кужалёк.
Мы лянок ірвалі, жалі, Абразалі,
у полі слалі, У снапочкі збіралі.
Урадзіся лянок
Белы, слаўны кужалёк.

Правілы гульні: дзеці павінны дакладна выконваць дзеянні, якія паказвае “бабуля”.

**Выхавальнік.** Васілінка, а што гэта ў цябе? (дастае лапці)

**Васіліна.** Гэта лапці, раней яны былі самым распаўсюджаным абуткам. Лапці насілі зімой і летам.

**Выхавальнік.** А з чаго плялі лапці?

**Васіліна.** Лапці плялі з берасты. З якога дрэва гэта кара? (Бярозы). Лапці з бярозы лічыліся святочнымі. Паглядзіце, як прыгожа яны сплецены. Сакрэты і ўменні, неабходныя для пляцення лапцей, перадаваліся з пакалення ў пакаленне, ад дзядоў да ўнукаў. Давайце ўважліва іх разгледзім, возьмем у рукі. Якія яны?

**Дзеці.** Вялікія, цвёрдыя, старыя.

**Васіліна.** Ногі ў лапцях дыхаюць, таму што праз дзіркі пляцення праходзіць паветра.

А завязкі патрэбны для чаго, як выдумаеце? Так, правільна, кааб лапці не зваліліся з ног.

**Фізкульхвілінка:** Дзеткі, мы зараз з вамі пагуляем: у круг уставайце і пад музыку перадаём адзін аднаму лапці. Як толькі музыка спынілася, у каго апынуліся лапці, той павінен станцаваць.

**Выхавальнік:** Васілінка, а што гэта такое прыгожае? А гэта ж куфэркі – каробачкі з крышачкай для захоўвання ўпрыгожванняў. Іх прыдумалі вельмі даўно. Кожны майстар стараўся зрабіць што-небудзь прыгожае, а некаторыя народы выкарыстоўвалі гэтыя драўляныя вырабы для паднясення дароў. У кожным доме захоўваліся такія маленькія куфэркі. (Дзеці бяруць у рукі і адчыняюць куфэркі).

Моўная гульня “Дапоўні сказ”

– Ручнік патрэбен для...

– Лапці адзенем куды...

– У куфэркі паложым што…

Малайцы, дзеці!

А вось у нас яшчэ ёсць дамавічок, ён аберагае ад нечысці і дапамагае

людзям. Патрымайце яго ў руках. (Дзеці бяруць яго на рукі, перадаюць адзін аднаму і выказваюць пажаданні).

**Выхавальнік.** Вось і скончылася наша падорожжа па нашым музеі. Спадзяюся, што вам спадабалася “Стужка часу”, у якой шмат цудоўных рэчаў. Давайце ўзгадаем гэтыя рэчы. Як яны называюцца і для чаго выкарыстоўваюцца? (Дзеці адказваюць на пытанні, выхавальнік удакладняе адказы). А напрыканцы давайце разгледзім вашы малюнкі. (Дзеці сумесна з выхавальнікам разглядваюць малюнкі, адзначаюць лепшыя).

Добра, слаўна папрацавалі, дапабачэння, лялька Васіліна, мы прыйдзем да цябе яшчэ раз у госці. Ведайце, дзеці: толькі той, хто любіць, шануе і паважае захаванае папярэднім пакаленнем, можа любіць Радзіму, пазнаваць яе, стаць сапраўдным патрыётам.